*Млын навін*

# Песні Вялікай Айчыннай

Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі рыхтуе праграму «Песні вайны», прысвечаную 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, паведаміў мастацкі кіраўнік калектыву народны артыст Беларусі прафесар Міхаіл Фінберг. Лепшыя выканаўцы заслужанага калектыву прадставяць землякам у розных рэгіёнах краіны песні, якія былі напісаны ў ваенныя гады і пасля Вялікай Айчыннай. Гэта праграма прагучыць цалкам на беларускай мове. Будуць выкананы творы, напісаныя самымі таленавітымі беларускімі кампазітарамі. Адкрые праграму песня «Радзіма мая дарагая» на музыку кампазітара Уладзіміра Алоўнікава.

* * *

У межах аўтарскага праекта вядомага калекцыянера і гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» да 100-годдзя заканчэння Першай сусветнай вайны ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у сераду адкрыецца выстаўка «1918. Нараджэнне новага свету». Падчас мерапрыемства пройдзе дзве прэзентацыі. Калекцыянер прадставіць фотаальбом «Беларусь 1914—1918. Вайна і мір», які паказвае рэаліі Усходняга фронту вачыма расійскіх і германскіх салдат. А потым у музейным дворыку вядомая кампанія-распрацоўшчык камп'ютарных гульняў «*Wargaming*» зладзіць прэм'ерны паказ новага кароткаметражнага фільма «Атака мерцвякоў: Асавец» пра жахі Першай сусветнай на прыкладзе бітвы за Асавецкую крэпасць. Выстаўка «1918. Нараджэнне новага свету» не толькі дасць магчымасць пазнаёміцца з каштоўнымі гістарычнымі матэрыяламі, але і прадэманструе сучасныя падыходы да інтэрпрэтацыі трагедыі «Вялікай вайны».

* * *

Выстаўка «Спрадвечнае» ў межах мерапрыемстваў, прысвечаных 25-годдзю кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, адбудзецца 14 лістапада ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Экспазіцыя прапануе паразважаць аб унікальных набытках нацыянальнай культурнай спадчыны ў сучасным свеце, асабліва цяпер, калі мяняецца сама сістэма каштоўнасцяў, фарміруецца новая сацыякультурная прастора. Сярод удзельнікаў выстаўкі — вядомыя мастакі-педагогі: Рыгор Шаура, Аляксандр Кавалёў, Уладзімір Рынкевіч, Людміла Дамнянкова, Тамара Васюк, Ала Непачаловіч… Разам з педагогамі свае творы прадставяць выпускнікі кафедры, лаўрэаты спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, члены Беларускіх саюзаў мастакоў, дызайнераў, майстроў народнай творчасці і інш.

* * *

У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь ладзіцца выстаўка «Знакі Незалежнасці. Польскія грошы 1915—1939». У экспазіцыі, падрыхтаванай Падляскім музеем у Беластоку ў супрацоўніцтве з Польскім інстытутам у Мінску і Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь, прадстаўлены сотні банкнот і амаль дзвесце манет, якія адлюстроўваюць сітуацыю на грашовым рынку польскіх земляў часоў ваенных дзеянняў (1914—1918), а таксама эвалюцыю валюты, адроджанай польскай дзяржавы (1918 —1939). Шырокую палітру афіцыйных плацежных сродкаў дапаўняюць прыклады цікавых дасягненняў фальшываманетчыцкага майстэрства эпохі, інструменты іх стварэння, а таксама вагі для кантролю арыгінальнасці манет.

**Міра ІЎКОВІЧ**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ